Чаму вернікам не ўдзяляюць св. Камунію ў постаці віна?

Аўтар: кс. Андрэй Лішко паводле grodnensis.by
04.03.2018 00:00



Падчас прыняцця Гостыі вернікі рэальна яднаюцца з Езусам, які адкупіў чалавецтва сваім жыццём. Кансэкрацыя хлеба і віна ўказвае на тое, што Хрыстос аддаў сябе на Кальварыі да самага канца, да крывапраліцця. Таму св. Камунія з'яўляецца поўнай і ў тым выпадку, калі прымаем яе толькі пад відам хлеба.

Нават у тыя часы, калі ўдзяленне св. Камуніі ў 2-ох постацях было вельмі распаўсюджанай з'явай, святар, калі збіраўся да хворага дадому, браў з сабою Камунію толькі пад выглядам хлеба. І ніхто нават не думаў, што ў дадзенай форме Эўхарыстыі можа чагосьці не хапаць. Але як здарылася так, што ў пэўны момант Заходні Касцёл вырашыў удзяляць св. Камунію толькі ў постаці хлеба? Гэта адбылося ў XII ст. па некалькіх прычынах: † • Менавіта ў той час у Касцёле шырока развілася эўхарыстычная набожнасць.

Людзі больш чым раней непакоіліся пра тое, што падчас удзялення св. Камуніі ў постаці віна маленькая кропля можа ўпасці на зямлю або ксёндз часам несвядома нахіліць келіх і г. д.

• На гэтую змену, безумоўна, мелі ўплыў і цяжкасці, звязаныя са здабыццём віна.

• Важную ролю ў адмаўленні ад удзялення св. Камуніі пад выглядам віна мела і тая акалічнасць, што ў Новым Запавеце хлеб у сакраманце Эўхарыстыі прадстаўлены як першасны (асноўны) элемент, а віно – як дадатковы.

Ці адрозніваецца Камунія ў 2-ох постацях ад Камуніі ў 1-ой з іх? Так. Але розніца заключаецца толькі ў памеры сакраментальнага знаку, сімволікі. І ніяк не ўплывае на памер ласкі, якая ўдзяляецца праз дадзены сакрамант. Ва ўводзінах да Рымскага Імшала гэта тлумачыцца наступным чынам: "Прыняцце св. Камуніі пад 2-ма постацямі становіцца больш поўным выразам праз вымову знаку (ratione signis pleniorem).

У дадзенай форме паказваецца ў дасканалым святле знак эўхарыстычнай гасціны і ясна выражаецца воля завяршэння новага і вечнага запавету ў Крыві Пана; таксама падкрэсліваецца сувязь паміж эўхарыстычнай гасцінай і канчатковай гасцінай у Нябесным Валадарстве" (№ 240).

Аўтар: кс. Андрэй Лішко паводле grodnensis.by
04.03.2018 00:00

Тут жа ўзгадваюцца ўсе выпадкі, калі, карыстаючыся сілай паўсюднага закона, можна ўдзяляць св. Камунію ў 2-юх постацях. Найбольш часта сустракаюцца наступныя сітуацыі: сужэнцам падчас шлюбу ў спалучэнні са св. Імшой; дыяканам падчас св. Імшы пасвячэння; асобам, якія складаюць манаскія абяцанні або аднаўляюць іх падчас літургіі; падчас Эўхарыстыі ў доме хворага і падчас св. Імшы, якая цэлебруецца для розных душпастырскіх груп.

На заканчэнне трэба адзначыць, што сёння назіраецца выразная тэндэнцыя да распаўсюджвання практыкі ўдзялення св. Камуніі ў 2-юх постацях.